
Летуценнік Севярын
Ян Баршчэўскі


Быў ён з лепшых вучняў...
Меў вялікую ахвоту вывучаць замежныя мовы...
Ідыліі Феакрыта
Геснер
Шымановіч
А чытаў найбольш паэзію...
Паўсюль ён бачыў Аркадзію...


Калі ён выходзіў на шпацыр за горад, дык у ручаях бачыў наядаў, на лугах скакалі німфы, а ў засені дрэваў з пад зялёнага вэлюму ўсміхаліся яму дрыяды...
Усюды сустракаў ён старажытны залаты век грэкаў... не ведаў, што ёсць бяда на свеце...
...калі настаўнікі з вучнямі агледзілі музей...
Музей
Аднаго разу...
Адгадай дзядок, што ў мяне ў руцэ?
Севярын выпусціў мух...
...і пабег...
О, нешчаслівы Ты будзеш выгнаны з раю... нікчэмныя інсекты будуць гнацца за табою.


Спачатку толькі ва ўяўленні...
...бачыў ён пекных багінь...
...Нарэшце спаткаў іх у свеце.
Усе дочкі Евы такія... ...прырода...
...Вужака золата і ганарлівасці звялі Адэлю, яна здрадзіла Севярыну...


Першае каханне, да таго ж нешчаслівае — вышэйшая навука
...пуціны бяруць накірунак на поспех і няўдачы Тут ён сустракае няраз...
Вар'ят!..
Вар'ят!!..
Насмешлівыя вочы
Нясталае сяброўства
Пасля гэтага здарэння зрабіўся ён самотны...


Калі я вандраваў у тых краях... дык адведаў яго...
Ён... доўга, не пазнаючы, глядзеў на мяне. Я назваўся.
Як маешся, Севярын?
А! Даўно чакаю!
Мае мары, і жарты зніклі, цяпер у мяне іншыя погляды...
А ўжо колькі гадоў прайшло... Шчаслівыя былі часіны! Ці ўспамінаеш цяпер... забавы, размовы, прыемныя мары, жарты, у якіх ты заўсёды вёў рэй?
Як ты змяніўся! Няўжо табе абрыдла ўсё пад сонцам?
Усё. Расказаў бы шмат, але баюся, бачыш: ўсюды вакол нас лётаюць мухі. Бачыш... Яны ўсё разнясуць па свеце ...як яны пераменяюцца ў монстраў... глядзяць на мяне, адны зазекліва, другія пагрозліва.
Вялікая розніца ў тваіх мроях. Раней цябе захапляла паэзія грэкаў і шчырае каханне... цяпер жа фантазіі нейкія журботныя.
...пра гэтых нягодных мух. Прыйшло мне ў галаву сказаць у вершы пра свае пачуцці... да сям'і і да Адэлі. ...Яна прачытала, паклала на стале... але і там мухі... ...звінелі датуль над вухам Адэлі, пакуль яна зусім не забыла пра мяне...
Саранчы ў нашым краі няма. Яна на ўсходзе.
Ці бачыў ты калі саранчу?
Не бачыў ты гэту тоўстую жамяру. Ана ей — іерогліфы. Хто ўмее, той выразна прачытае... „Кара Божая"... ...Пайшлі... пакажу...



Ён вывяў мяне на бераг імклівай ракі...
Я часта наведваю гэтыя мясціны... Люблю адзін сядзець... Успамінаю ўсе размовы... ...з Адэляю
Нейкая чорная меланхолія зацьміла твае думкі; усё бачыш ты ў пачварных вобразах. Нешчаслівы з такімі думкамі ніколі не прычакаеш спакою.
Глядзі, глядзі! Вось, ляціць саранча! Бачыш яе? Падводныя шэрыя крылы, яна сюды тут у нас лётае і жарэ ў паветры і на зямлі... ніколі не гіне, як шатан, з'яўляецца ў розных абліччах...
Вось і не здагадаўся! Я маю добрую думку: буду падарожнічаць. Далёка ў чужых краях, дзе пануе вечная вясна... ...пра Адэлю нават і не ўспомню, бо паміж намі будзе вечнасць. Вечнасць!..
І родны край забудзеш?
О, не! Калі не вярнуся на Бацькаўшчыну і памру недзе самотны на вяршыне гары ў чужым краі, крукі занясуць туды мае косці; усё лепей быць пасля смерці з птушкамі, а не з чарвякамі.
Я быў там цэлы дзень; блукалі з ім па гарах і лясах... ...доўга размаўлялі...
...Затрымаў мяне і на ноч. ...Уначы ён часта ўсхопліваўся...
...Наступнага дня...
...прывітаў мяне...
Дзякуй, што праведаў! Застанься яшчэ, калі ласка, на абед... калі можаш...
...пасля абеду Севярын прынёс найлепшага віна...
Давай вып'ем... Гэта апошняе развітанне, убачымся ўжо хіба што на тым свеце.
...загадаў запрэгчы коней...
...правёў мяне... ...развітаўся са слязьмі.
...Ці жыве яшчэ, ці, можа, памёр ужо ў чужым краі і між чужога народа.